Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 145 (527) Субота, 31 сьнежня 1927 г. | Выходзе тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

НАБЛІЖАЕЦЦА ЧАС БАЯВОЙ ПРАВЕРКІ.

УСЯ БЯДНЯЦКАЯ, БАТРАЦКАЯ І СЕРАДНЯЦКАЯ МОЛАДЗЬ—НА ПЕРАВЫБАРЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ!

Саветы заваяваны кроў'ю тваіх бацькоў—паважай іх, будзь гарачым удзельнікам іх вялікай работы.

Важнейшая задача дню.

З 15-га студзеня па ўсёй Беларусі распачынаецца кампанія перавыбараў сельсаветаў.

Гэтай кампаніі комуністычная партыя і савецкая ўлада надае асаблівае па сваёй важнасьці і адказнасьці значэньне.

У часе падрыхтоўкі і правядзеньня кампаніі перавыбараў саветаў кожная комсамольская організацыя, кожная ячэйка павінна выходзіць з таго, «што гэта кампанія зьяўляецца галоўнейшай політычнай кампаніяй партыі, што ў гэту кампанію праводзіцца асноўная лінія партыі ў працы КП(б)Б і яе асобных організацый, вызначаюцца канкрэтныя дасягненьні і недахопы за год і намячаюцца дырэктывы на далейшае для ўсяе савецкай сыстэмы». (З лісту ЦК КП(б) Б).

Удзел ЛКСМБ у кампаніі перавыбараў саветаў 1926-27 г., у параўнаньні з мінулымі гадамі, значна пашырыўся, па якасьці палепшыўся. Была праведзена своечасовая і досыць шырокая падрыхтоўчая работа да перавыбарчай кампаніі, паднялася актыўнасьць, павысілася ўдзельная вага моладзі на перавыбарах, якая пайшла за партыяй і комсамолам, абвялічыўся процант комсамольцаў, абраных у сельскія, местачковыя і гарадзкія саветы і іх рэвізыйныя камісіі.

Але побач з гэтым былі значныя і недахопы ўдзелу КСМ у перавыбарнай кампаніі.

Зусім слаба была праведзена работа сярод рабочай моладзі саўгасбота сярод рабочай моладзі саўгаспадарак і парабкоў, адсюль—зусім слабы ўдзел іх у сходах беднаты і ува ўсёй перавыбарчай кампаніі.

Значнай часткай ячэек і РК ня была добра організована і ўцягнута беспартыйная, асабліва бядняцкая (апошняя ня была амаль зусім уцягнута на сходы беднаты) моладзь у прадвыбарча-справаздачную, а таксама і ў выбарчую кампанію; асабліва нездавальняючая работа была праведзена сярод дзяўчын сялянак.

Перавыбары саветаў у 1928 годзе будуць праводзіцца пад лёзунгам узмацненьня дасягнутых посьпехаў і рашучага зьніжэньня адмоўных бакоў.

Комсамольская організацыя, бяручы на сябе задачу быць галоўным і шчырым памоцнікам і праваднікам агульных політычных дырэктыў партыі ў прадстаячую кампанію перавыбараў саветаў павінна абавязкова старанна і своечасова падрыхтавацца сама, падрыхтаваць і організаваць усю беспартыйную працоўную моладзь гораду і вёскі для ўдзелу ў апошніх, зьнішчаючы вышэйадзначаныя недахопы ўдзелу мінулага году.

Комсамольскім організацыям і паасобным ячэйкам трэба зараз-жа добра ўцяміць адну пагаворку, што «адклады ня йдуць на лады» і узяцца за работу.

Трэба правесьці раённыя і сельсавецкія нарады комсамольцаў-сельсаветчыкаў. з прыцягненьнем на іх шырокіх мас беспартыйнай моладзі. Трэба правесьці сходы вясковых дзяўчат па пытаньні ролі іх удзелу ў працы саветаў і гэтым самым забясьпечыць іх прысутнасьць на прадвыбарчых і перавыбарчых сходах.

Батрацкая і бядняцкая моладзь у мінулых перавыбарах удзельнічала слаба. У сёлетніх перавыбарах гэты недахоп павінен быць поўнасьцю зьнішчан.

Клюбам, хатам-чытальням, драматычным, музычным, харавым і інш. гурткам трэба падрыхтаваць спэцыяльныя «перавыбарчыя» нумары і наладжваць пасьля сходаў концэртныя часткі.

Кампанія перавыбараў саветаў—вельмі адказная кампанія. Яна пакажа, як комсамол навучыўся організоўваць вакол конкрэтнай справы шырокія масы беспартыйнай моладзі.

Трэба зацугляць кулака.

З вопыту леташніх перавыбараў сельсавету вядомы факты, калі кулак усю сваю радню уцягнуў на сходы, а ба ракоў прымушаў сядзець „берагчы хату“, альбо ў гэты час куды небудзь далёка пасылаў яго «за якімі небудзь справамі», пагэтаму і па другіх яшчэ прычынах, шмат батракоў былі ізаліраваны ад перавыбарнай кампаніі.

Ячэйкам КСМ неабходна цяпер ужо прымацаваць комсамольцаў да батракоў для таго, каб яны ім растлумачвалі ролю іх удзелу ў перавыбарах, прыцягвалі на сходы беднаты, на перавыбарчыя сходы і г. д. Такім чынам, ня даць магчымасьці кулаку «хаваць» батрака ў часе такой важнай кампаніі.

У дзень перавыбару, за некалькі гадзін наперад, усе комсамольцы павінны зьявіцца ў вызначанае месца з музыкай і пайсьці па хатах сабіраць дзяўчат і астатнюю моладзь і організованым парадкам пайсьці на перавыбарчы сход. Пасьля перавыбараў магчыма організаваць вечарынку, падрыхтаваць вусную газэту, дэклямацыі, частушкі, танцы і г. д. і гэтым самым ператварыць кампанію перавыбараў сельсаветаў у вялікае політычнае сьвята працоўных мас сялянства.

С. Яндульскі.

Вёска рыхтуецца.

Вучастковыя сходы беднаты.

Па ўсіх акругах БССР распачалася падрыхтоўка да перавыбараў сельскіх і местачковых саветаў.

Усе раёны падзяляюцца на вучасткі, па якіх будуць праведзены сходы беднаты, прысьвечаныя падрыхтоўцы да перавыбараў. Па вёсках, дзе жывуць палякі, яўрэі і латышы адбудуцца асобныя конфэрэнцыі гэтых нацменшасьцяў па пытаньню іх удзелу ў перавыбарах.

З 15 студзеня па 15 сакавіка.

Менакрвыканком зацьвердзіў плян справаздачна-перавыбачай кампаніі сельскіх і местачковых саветаў па Менскай акрузе.

З 15-га студзеня да 5-га лютага ўсе сельсаветы акругі абавязаны даць справаздачы аб сваёй працы перад мясцовым насельніцтвам. Перавыбары-ж саветаў адбудуцца паміж 5 лютага і 15 сакавіка.

Пачакайце да... заўтра.

(Старасельскі сельсавет, Копыскага раёну, Аршанскай акругі).

Нядаўна старшыня нашага сельсавету рабіў справаздачу перад РВК аб гадовай працы. Выявілася, што Старасельскі сельсавет мае ў сваёй працы шэраг недахопаў.

Наш сельсавет мала цікавіўся працай грамадзкіх організацый на вёсцы і амаль не дапамагаў ім. **Камітэт узаемадапамогі працуе слаба, з 150 чалавек беднаты коопэравана толькі 18, праўленьне спажывецкай коопэрацыі займаецца спэкуляцыяй, летась пры сельсавеце быў створан шэраг камісій, якія засталіся толькі на паперы і г. д.**

Трэба адзначыць, што старшыня сельсавету дрэнна адносіцца да сялян-беднякоў. Калі апошнія зьявяцца ў сельсавет з якой-небудзь скаргай ці заявай, старшыня, як ні ў чым ня бывала, закурвае люльку, насоўвае шапку, уходзіць і пакідае сялян чакаць... аж да заўтра.

Чым тлумачацца ўсе гэтыя недахопы? —трэба сказаць, што сельсавет ня выконваў тых дырэктыў, якія своечасова даваліся яму Райвыканкомам.

У часе надыходзячых перавыбараў неабходна нашым выбаршчыкам уважліва і асьцярожна абмеркаваць кожную кандыдатуру, высоўваемую у савет і даць яму добры наказ, у якім-бы абараняліся інтарэсы беднаты.

Б. Фэйгін.

Там, дзе комсамольцы ня сьпяць.

(Прапойскі сельсавет, Магілеўскай акругі).

Наш сельсавет карыстаецца сярод насельніцтва даволі значным аўтарытэтам. Ды і ёсьць за што.

Амаль уся бедната ўцягнута ў коопэрацыю, створана пажарная дружына, у якой нашае насельніцтва доўга адчувала патрэбу, дадзен шэраг ільгот незаможным сялянам па сельгаспадатку, дзякуючы чаму апошні ўносіцца ў вызначаны тэрмін і г. д.

Трэба сказаць, што комсамольцы, якія вылучаны для працы ў сельсавет, прымаюць там актыўны ўдзел. Па іх ініцыятыве створана бібліотэка пры хаце-чытальні, выдаецца насьценная газэта ды інш.

М. Г—ў.

Прэч з Саветаў гадаў гэтых...

Сьвішча вецер,
Позна ў вечар,
Засьпявалі правады.
А ў сёлах—
Быццам пчолы,
Гудуць сходы беднаты.
І мужчыны і кабеты,
Разважаюць, ды ня раз,
Каго-б выбраць у саветы,
Ды памесьціць ў гэты час.
З кожнай хаткі,
Бацька матка,
Дзеці, дочкі і сыны.
Пойдуць скора
У аўторак
Ўсе на выбары яны.

Разгулялася завея,
Сьнягі скачуць казака.
У савеце месь Андрэя?—
Нам ня трэба лайдака.
Ах Андрэйка!
За бутэлькай
У сельсавеце вечна п'ян.
Ды узяткі—
Хітра, гладка
Цягне моўчкі ад сялян.
А у полі
Тры таполі,
На таполях шмат гукоў.
Прэч з Саветаў
Гадаў гэтых,—
Бюрократаў, кулакоў.

З. Бульбянік.

XI зьезд КПБ і комсамол.

Артыкул 4-ты*)

Дзякуючы правядзеньню правільнай політыкі партыі, вёска зараз перажывае эконамічны ўздым, асаблівасьцямі якога зьяўляюцца «значнае пасіленьне плянавай рэгулюючай ролі пролетарскай дзяржавы на сельскую гаспадарку і рост уплыву соцыялістычных элемэнтаў у самой вёсцы». Побач з гэтым трэба адзначыць, што пры пролетарызацыі некаторай часткі беднаты і некаторым росьце кулацкіх элемэнтаў вёскі, серадняцкая маса вёскі, папаўняючыся бядняцкімі гаспадаркамі, якія эконамічна ўздымаюцца, застаецца па ранейшаму галоўнай сілай земляробства.

У вёсцы ідзе процэс эконамічнага ўздыму асноўных сялянскіх мас, у тым ліку і значнай часткі бядняцкіх. Група беззасеўных гаспадарак зьменшылася з 9,8 проц. у 1917 г. да 1,4 проц. у 1926 г. Гэта адбылося, галоўным чынам, па прычыне надзяленьня зямлёй безьзямельных. Значна ўзрасла група сярэднязасеўных гаспадарак: проц. гаспадарак з засевам ад 2-х да 6 дзесяцін узрос з 55,3 проц. у 1917 г. да 65,5 проц. у 1926 г. Процант бясконных гаспадарак зьменшыўся з 15,5 проц. у 1917 г. да 13 проц. у 1926 г., бескароўных з 9,5 проц. у 1917 г. да 4,3 проц. 1927 г.

Ідзе бязупынны рост вытворчых сіл вёскі і эконамічнага ўздыму бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, ідзе рост соцыялістычных элемэнтаў ў вёсцы.

У сучасны момант у вёсцы на аснове эконамічнага росту, ідзе барацьба паміж дзьвума тэндэнцыямі ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі—соцыялістычнай і капіталістычнай. Выходзячы з гэтага XI зьезд высунуў як галоўную задачу ў політыцы КПБ ў вёсцы, забесьпячэньне няўхільнага узмацненьня і пашырэньня соцыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, усямернага разгортваньня коопэраваньня с. г. разьвіцьця, яе колектыўных форм.

Адсюль перад комсамолам паўстае шэраг практычных задач.

Як адну з асноўных задач у працы па разьвіцьцю вёскі, зьезд падцьвердзіў палажэньне аб значэньні коопэрацыі.

Разьвіцьцё коопэрацыі ў вёсцы ў апошнія гады характарызуецца агульным ростам сеткі сельска-гаспадарчых коопэрацыйных аб'яднаньняў, галоўным чынам за кошт організацыі вытворчых аб'яднаньняў (малочныя, маславытворчыя, сыраварныя арцелі, мэліорацыйныя, насеннаводныя, машынныя і іншыя таварыствы). Разьвіцьцё гэтых відаў коопэрацыі ідзе ў пераважнай сваёй частцы за лік ахопу бядняцка-серадняцкіх пластоў сялянства. Сельска-гаспадарчая коопэрацыя ўсё болей і болей забясьпечвае сялянскія гаспадаркі сродкамі вытворчасьці, дапамагае перапрацоўцы і збыту сялянскіх продуктаў.

Але ўсё-ж яшчэ бядняцкія гаспадаркі коопэраваны слаба. Комсамольскія ячэйкі могуць у многім партыі дапамагчы ў коопэраваньні беднаты. Вялікую ролю ў гэтым можа адыграць стварэньне вакол коопэрацыі належнае грамадзкае думкі. Памятаць, што разьвіцьцё с.-г. коопэрацыі спрыяе павялічэньню с.-г. продукцыі і забясьпечвае рост соцыялістычных элемэнтаў сельскай гаспадаркі. Ініцыятыва комсамольцаў у організацыі малочных, масла-вытворчых, сыраварных і іншых простых відаў арцеляй, будзе лепшым сродкам агітацыі сялянства за коопэраваньне. Дапамагчы партыі ў гэтай справе мы можам яшчэ і тым, што будзем выяўляць у вёсцы беднату, будзем дапамагаць, каб с.-г. машыны, каб с.-г. крэдыт пападаў у першую чаргу бедняку. А меўся шэраг выпадкаў, калі с.-г. машыны, калі с.-г. крэдыт пападаў у кулацкія гаспадаркі і ў меншай долі ў бядняцкія і серадняцкія.

(Працяг будзе).

Л. Галавач.

*) Гл. № 143.

Лазьня.

Калі пасьля доўгага ўпрашваньня і засароміваньня, што „тут вам ня Ніжні Базар» і «не талкучка» ячэйкавы сход крыху ўгаманіўся, старшыня сходу лішні раз пастукаў па стале пажованым канцом кароценькага фабэраўскага алоўку і зьвярнуўся да комсамольцаў:

— Дык я думаю, хлопцы, што пасьля нашых сёнешніх доўгіх спрэчак прымем такую пастанову—«лічыць неабходным пабудаваньне лазьні ў нашай вёсцы Карані. Дзеля гэтага комсамольцам-сельсаветчыкам Міхалю Станіслаўчыку і Ягору Бітусу паставіць гэта пытаньне ў сельсавеце і на адным з сходаў ячэйкі паведаміць аб выніках».

— У каго ёсьць другая прапанова?

— Хто супроць?

— Няма нікога... Запішы, браток Мікола, у пратакол...

Сход закончыўся. Пасьля доўгіх спрэчак прынялі пастанову. Але ніхто з комсамольцаў і ня думаў пакідаць чытальню. Падняўшыся са сваіх месц, хлопцы групаваліся ў кучкі і працягвалі спрэчкі. У адной кучцы, якая сабралася каля кніжнай шафы, Міхайла Станіслаўчык адным чынам даводзіў:

— Брыдка, хлопцы, ня верыць у свае сілы! Дакуль-жа нам на словах будаваць 20-ціпавярховыя камяніцы і ўсякія там соцыялізмы, а на справе—хадзіць забруджаными, закарэўшымі, ня вымытымі.

У другой кучцы, што занялаповіцы каля вайсковага кутку, нехта ахрыпшым голасам не згаджаўся:

— На што нам што якое: возьмем Міхайлавага бацьку. Шмат у яго грошай?—Вецер у кішэні. А ў каго-ж яны ёсьць? Дык навошта-ж шукаць у пустой скаварадзе смачнай скваркі. Гэта ўсёроўна, што па вадзе пугаю: ляснуў, пайшлі брызгі, ды нічога не засталося...

Трэція прыслухоўваліся то да адных, то да другіх і разьвярнуўшы грудзі глыбокім уздыхам, звяваючы, цадзілі праз зубы:

— Пажывем—пабачым.

На пленуме сельсавету пастаўленае комсамольцамі пытаньне аб лазьні ўсіх ашарашыла. Дзядзькі пераглянуліся паміж сабою, ухмыльнуліся і ўваперліся вачыма ў стол прэзыдыуму. А сельсаветчыца Куліна, па натуры—гаварлівая баба, не зманўчала, пакратала рукою Мікіту за плечы і шопатам прагаварыла над яго вухам:

— Вось тады Максіму будзе выгада... а то бядняга ў начоўках ломіць свае старыя косткі.

Некалькі суседзяў ціханька зарагаталі, а Мікіта павярнуўся назад і глянуўшы на Куліну, адказаў ёй:

— Не памяшае і табе папарыцца, а то можа там ужо, хоць на сахор бяры...

Узяў слова старшыня сельсавету Банадысь Плашчынскі. Ён сьмяяўся і раней з такой комсамольскай думкі, угаварваў Міхайлу і Ягора нават і не «канціцеліць» пленум такімі дробязямі, бо ніхто не падтрымае.—«Яшчэ час той не падасьпеў».

— Я папярэджваў нашых комсамольцаў,—пачаў Банадысь тонам чалавека. які стаіць на вышыні свайго становішча,—што ня варта лазьнямі займацца калі ў нас яшчэ сьвядомасьць кульгае.

Банадыся пленум ня слухаў, бо ён заўсёды любіць, калі справа дойдзе да дзела, знаходзіць прычыны, якія перашкаджаюць ажыцьцяўленьню—то рана, то ўмоў няма, то калі гаварылі аб пажарнай дружыне—«грошай кот наплакаў», то калі аб шматпольлі думалі — «і на трахполцы жыта няма дзе сеяць».

Больш слухалі дзядзькі Міхайлу. Знаходзілі яго думку правільнай і, седзячы на лавах, сьцьвярджалі паціханьку—«во», «гэта дзела», «я панімаю».

Убачыў Банадысь, што яго не бярэ, падняў пальцамі ўверх правы вус, закруціў кончык сьвярдзёлачкам, і, надуўшыся, прагаварыў да Станіслаўчыка.

— Што ты практычна гаворыш?

— Я гавару тое: нам трэба стварыць ініцыятыўную групу—як-бы колектыў—і даручыць ёй гэту справу.

Пасьля пленуму Ягор запісваў у ініцыятыўную групу.

— Запішы, Ягорка, мяне.

— І мяне.

— І мяне прыткні хоць у канцы.

— А што мне памыцца ня хочацца?—засьмяялася Куліна. — Пішы, хлопча, і мяне!

...У вёсцы Карані 200 двароў. У групу запісалася 168 гаспадароў. Сабралі сход. Унесьлі па 3 рублі. Злажылі паўтысячы рублёў. Адкупілі ў былым маёнтку за 80 рублёў сьвірань. Узяліся за працу.

Самі перавозілі, самі складалі, крылі, печ рабілі, шклілі вокны, габлявалі дошкі, падвозілі дакуплены матар'ял. Праца кіпела: зьвінелі рыдлёўкі, сьвісталі фуганкі, стукалі абухі сякер па цьвікох. І ўсе—сваімі рукамі.

Ня было катла. Нехта даведаўся, што ў Журавінках, вёрст за 20 ад Каранёў, быў некалі бровар. Цяпер ён не працуе. А добры кацёл валяецца каля саду і ржавее.

Паехалі ў РВК. Дасталі дазвол. Прывезьлі круглы кацёл, як вялізарны дубовы кубел.

...Радаваліся комсамольцы, гледзячы як жанчыны па пятніцах, а мужчыны па суботах зялёнымі венічкамі і з скруткамі бялізны пад пахаю сьпяшаліся ў канец вёскі, дзе на выгане прытуліўшыся до берагу рэчкі, стаіць лазьня.

Папарыўшыся, вымыўшыся цёплай вадзіцай, мужчыны, укручваючы ногі доўгімі аборамі, вялі гутаркі аб лазьні і сьмяяліся над тым, як кацёл везьлі.

— А цяжкі, падла!—сказаў Максім—ужо-ж якія моцныя паўлюковы калёсы, а даліся...

— А вы ведаеце, мужчыны, што пасьлязаўтра ў школе перавыбары?

— Ды каго там выбіраць. Зацьвердзіць стары.

— А хто ўпэўнен у тым, што калі выбярэм цябе ў сельсавет, дык у другім канцы вёскі ня будзе стаяць фабрыка? — жартавалі там мужчыны, пакідаючы лазьню.

Зьм. Паваротны.

Кузьня чырвоных камандзіраў.

7 год Аб'яднанай вайсковай школе імя Ц. В. К. Беларусі.

Ад пастуха—да чырвонага камандзіра.— На фабрыкі і заводы з вайсковымі ведамі.—Комсамолец—прыкладны курсант і грамадзкі працаўнік.—Што кажуць выпускнікі аб школе.

Пераможцам у будучых бойках.

ЦК ЛКСМБ шле шчырае прывітаньне курсантам і каманд-ка-палітычнаму складу Аб'яднанай Вайсковай Школы імя ЦВК Беларусі ў дзень 7-гадовага існаваньня.

7 год слаўнай працы школы былі накіраваны на падрыхтоўку кавалёў перамогі Чырвонай арміі ў прадстаячых клясавых бойках.

У дзень 7-годзьдзя школы мы зьвяртаемся да курсантаў:—няхай жыве яшчэ большае паглыбленьне якасьці работы школы, магутнасьць Чырвонай арміі.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ А. БАРАНЬНІКАЎ.

Кузьня чырвоных камандзіраў.

Сёньня ВВШ сьвяткуе 7-мігадовы юбілей свайго існаваньня.

У той час, калі хмары згушчаюцца над Савецкім Саюзам, погляды працоўных Беларусі павінны быць прыкованы да юбіляра. Кожны рабочы, селянін і асабліва комсамолец павінен прасякнуць адной думкай—**«узмацніць Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу—кузьню чырвоных камандзіраў».**

За 7 год свайго існаваньня не адну сотню падрыхтаваных, кваліфікаваных таварышоў паслала школа ў вайсковыя часткі на адказную працу. Па ўсёй Беларускай Вайсковай Акрузе ў Менску, Віцебску, Магілеве, Смаленску і г. д. вы знойдзеце камандзіра з АБВШ.

Комсамол Беларусі павінен ведаць, што школа на **70 проц.** укомплектавана з комсамольцаў, што комсамольскі колектыў зьяўляецца сапраўды першым памочнікам каманднa-палітычнаму складу ў справе баяздольнасьці школы, што комсамольскі колектыў зьяўляецца першым застрэльшчыкам у справе ваенізацыі рабочай і вучнёўскай моладзі г. Менску.

Адсюль адказнасьць беларускага комсамолу і ў першую чаргу яго кіруючых органаў як перад партыяй, так і перад школай павялічваецца, бо комсамол пасылае туды сваіх таварышоў, бо яны будуць у будучых схватках з ворагам весьці свае разьдзелы, роты, а можа і вялікія (а гэта будзе) вайсковыя часткі ў бой.

Кожнае лета пры абвестцы аб наборы ў школу трэба вылучаць у першую чаргу рабочых, батракоў і сялян-беднякоў з вытрыманых комсамольцаў, якія перанесьлі-б усю цяжкасьць 3-4-гадовага навучаньня вайсковай справе. Трэба растлумачыць, што навучыцца трымаць зброю, а потым вучыць іншых, гэта ня тое, што зьесьці ў цешчы касьцёр аладак. Служыць рабочай клясе, быць яе ўзброенай часткай, мець вытрымку, адвагу—«трошкі» цяжэй.

Трэба скарыстаць зімовы пэрыяд для агульнай падрыхтоўкі тых комсамольцаў, якія жадаюць паступіць у школу, але ня маюць патрэбнай адукацыі. Гэта больш за ўсё датычыцца вясковых ячэек, бо мы маем прыклады, калі батрак, ці селянін, ня вытрымліваючы залік, з болем у сэрцы, ідуць назад дадому. А нам якраз такія социяльна-блізкія і жадаючыя вучыцца і патрэбны.

Штотыднёва падтрымліваць сувязь з пасланымі ў школу, падбадзёрываць іх, інфарміраваць аб жыцьці і становішчы сваёй ячэйкі, арганізацыі, прасіць ад іх саветаў па справе ваенізацыі.

Пры провадах у нас шмат абяцаньняў, урачыстых прамоў, а потым... «памятай як звалі». Такая пастаноўка пытаньня нікуды ня варта. Сувязь, таварыскія парады, дапамога сем'ям пасланых—не павінны сходзіць з парадку дню ячэек і райкому.

Мы сьвяткуем юбілей школы не для сьвята. Сьвята бяз мэты—нікчэмна. Напомніць яшчэ раз аб тым вялікім удзеле, які прымае комсамол у будаўніцтве Чырвонай Арміі, **напомніць яшчэ раз аб галоўных задачах ваенізацыі рабоча-сялянскай моладзі—вось мэта юбілею.**

Няхай-жа жыве наш комсамольскі юбіляр—А. Б. В. Ш.

В. В.



Па фабрыках і школах.

Нашы комсамольцы ведаюць, што мы можам перамагчы толькі тады, калі будзе моцны тыл, калі ўся рабоча-сялянская моладзь будзе ваенізаваная.

Вось чаму ледзь ня кожны дзень у часы пазашкольнай працы вы ўбачыце вашых курсантаў ідучымі са стрэльбамі, дыяграмамі і другімі матар'яламі пад пахай па фабрыках і заводах, па школьных установах. Там яны ваенізуюць моладзь.



Курсанты вывучаюць кулямёт.

Пачынаючы з шустрых фабзайчат МШУ, з Рабфаку і БДУ, с. г. майстэрні імя Бурбіса, Мэдфака, агульна-адукацыйных курсаў і канчаючы Камароўскім атрадам юных піанэраў, усюды вы ўбачыце нашых комсамольцаў.

Маюцца ў нас і недахопы. Калі мы прыходзім ці на завод, ці ў школу, дык часам прыходзіцца чакаць 20-30 хвілін, а то і цэлую гадзіну.

Зусім не па вайсковаму зьбіраецца наша моладзь на заняткі, а для курсанта час дарагі.

Трэба з боку рабочай моладзі добра адносіцца да ваенізацыі і не спадзявацца толькі на заняткі. Вайсковая самаадукацыя кожнага маладога рабочага—вось наша задача.

Больш уцягваць моладзь у гурткі, у Осоавіяхім. Калі тыл наш будзе гатоў мы скажам: «Нам не страшны вораг».

В. Грыневіч.

Падкован на абедзьве нагі.

Сам да паступленьня ў школу я працаваў на лесапільным заводзе ў г. Віцебску. У 1924 годзе праз профсаюз атрымліваю камандзіроўку і еду ў АБВШ на гарматнае аддзяленьне.

За 4 гады я зьмяніўся. Кругавід мой пашырыўся. Я атрымаў як агульную, дык і палітычную сярэднюю адукацыю, а галоўнае я цяпер ведаю вайсковую справу,—падкован на абедзьве нагі. Маю практычныя навыкі, як па комсамольскай, так і па партыйнай рабоце.

Цяпер я веру ў сваю моц і буду не апошнім у барацьбе рабочае клясы за пабудову соцыялістычнага ладу.

Антось Ярмаковіч.

Шчыра дзякую за выхаваньне.

З малых гадоў я батрачыў, пасьвіў скот у сяле Гарбацэвічах, што на Бабруйшчыне. У 1925 годзе Акругкамол мяне камандыруе ў АБВШ.

Правучыўшыся 3 гады, я не магу параўняць сябе з тым, што быў раней. Цяпер мяне навучылі разьбірацца ў міжнародным становішчы, я зразумеў клясавую барацьбу. Цяпер я ўмею ня толькі лапці плесьці, але ўмею ўладаць такой складанай машынай, як гармата.

У дзень 7-ай гадавіны шчыра дзякую кампалітскладу школы за выхаваньне і адукацыю.

Я не магу выказаць тых пачуцьцяў, таго энтузіязму, з якім гатоў узяцца па сканчэньні школы за выхаваньне такіх пастухоў, якім я быў сам да паступленьня ў школу.

Янка Касьцючык.

Янка—камандзір.

З малых гадоў Янка быў пастухом. Лясы, балоты, дуда..., каровы... складалі ўсё яго жыцьцё. Ахвоч ён быў і да птушак. Ведаў 25 гнёзд, але ніводнага не чапаў. Па магчымасьці пасягаў і на панскае дабро: лазіў у сад за яблыкамі, заганяў у шкоду вясковых кароў. Не баяўся, што калі зловіць эканом, дык высеча крапівою па мяккаму месцу.

Зімою Янка бегаў у школу, вучыўся прыкладна, арганізоўваў сьнежныя бойкі. За сваю жвавасьць ня раз атрымліваў ад настаўніка лапы.

* * *

Пачалася вайна... Цягнуліся войскі па шляху Бабруйск—Слуцак. Любіў Янка быць блізка каля шляху, пагдядаць на салдат, трубіць сваей пастускай дудой. Крычыць на быдла... «падаваць каманду»... Але ня слухалі яго... Захацелася Янку здабыць сябе стрэльбу. Але-ж дзе яе здабудзеш?

Змайстраваў лук замест стрэльбы, нарабіў стрэл... прыкладна налаўчыўся пападаць у варон... нават ластаўку адзін раз на ляту забіў...

* * *

Прышоў Янка ў школу. Глядзіць—няма партрэту «Мікалая», за шуфляду закінулі... Думаў і маліцца ня трэба... на малітву ганяюць... Потым, як пачалася «завіруха». Ніяк ня мог зразумець Янка, што гэта робіцца на сьвеце. Бальшавікі... Немцы... Палякі...

Пачаўся фронт у іх сяле. Кожны месяц страляніна. Гарматы бухаюць... жужжаць знарады... Адным такім знарадам яго любімую кароўку забіла... Зрабіў і Янка сабе гармату. Расчэніць кіёк, заложыць камень, ды як пусьціць! Віжжыць як знарад... што сапраўдная гармата...

* * *

Дваццаты год... Супакоілася крыху... Быў Янка ўжо пятнаццацігадовым хлапчуком. І калі з Бабруйску прыехаў «лянструктар» і сабраўшы сход моладзі, абвясьціў аб запісу ў комсамол, падышоў і Янка абуты ў вялізарныя лапці:

— Стрэльбу дадуць?..

— А як-жа з бандытамі біцца бяз стрэльбы?

— А можа кулямёт і гармату дадуць?

— Даць, дык не дадуць, а навучаць, як страляць трэба—ухмыльнуўся «лянструктар».

— І гэта добра, усё-ж такі ня кіёк!

Ходзіць Янка ў ячэйку... А праз некаторы час. Добра зразумеў задачы комсамолу. стаў сур'ёзным, актыўна ўзяўся за працу.

Але дзе тут да працы? Трэба са стрэльбаю вартаваць у Выканкоме, ісьці ў аблаву. Там бандыты зьявіліся,—трэба з атрадам туды скакаць...

* * *

Ня чутна бандытаў... За мірную працу ўзялася ячэйка. Янка ўжо—сябр выканкому—кандыдат партыі. Падымаюць сельскую гаспадарку, арганізуюць колектыў, усюды Янка першы.

У 24-м годзе прыходзіць з Акругкамолу паперка, аб набору ў вайсковыя школы... Заварушыўся Янка. Просіць ячэйку камандыраваць яго.

— «Які-ж ты грамацей, куды-ж ты пойдзеш?

— «Нічога»—адказваў Янка. — Як небудзь вытрымаем залікі.

* * *

А вось чацьверты год ужо вучыцца Янка ў АБВШ, рыхтуецца стаць чырвоным камандзірам.

Ужо ня кіёк з каменьнем, а складаная машына—гармата—якой ён уладае добра. Прыцел 7—0, трубка 7—2, узровень—больш 0—02... Праваю гарматаю «агонь»... і снарад булькае, апісвае дугу ў паветры, ляціць туды, куды яго накіроўвае Янка...

Так з Янкі пастуха выкоўваецца чырвоны камандзір.

Воінаў.

ВЕЧАРАМІ ЗА КНІГАЙ.

Як мы вучымся ў палітшколах і палітгуртках.

Узмацнім палітадукацыю.

(Смалявічы).

Райком ЛКСМБ нядаўна правёў абсьледваньне працы комсамольскіх палітгурткоў. Праца апошніх распачалася са спазьненьнем (другая палова лістапада) дзякуючы несваечасоваму атрыманьню падручнікаў. Пліская ячэйка нават яшчэ не распачала працы, дзякуючы нядбайнасьці з боку бюро ячэйкі

Нездавальняюча пастаўлена мэтодыка працы. У большасьці заняткі праводзяцца так: кіраўнік чытае,—слухачы слухаюць, а потым паўтараюць. У выніку слабае ўсваеньне пытаньня. Тэорытычная праца палітгуртка ня ўвязваецца з практычнай, што таксама адбіваецца на ўсваеньні слухачамі.

У большасьці палітгурткоў не заведзены вучот працы, няма дзеньнікаў. Комсамольцы-адзіночкі, жывучыя ў аддаласьці ад ячэйкі на 5-7 вёрст палітвучобай не ахоплены і ніякіх заданьняў по палітадукацыі ад бюро ячэек не атрымліваюць.

Ячэйковы комсамольскі актыў ахоплены партгурткамі, дзе і набывае сваю палітадукацыю.

У мястэчку распачала працу школа рабочай моладзі і комсамольская палітшкола. 22 комсамольцы вучыліся ў партшколе стацыянарцы—рыхтуюцца да пераходу ў партыю.

Алесь Ліпнеускі.

Так узяліся, што толькі трымайся!

(Старобін, Бабруйшчына).

Спалі мы з палітвучобаю. Але цяпер так узяліся, што толькі трымайся! Пры двух местачковых ячэйках працуе стацыянарка, вячэрняя школа рабочай моладзі і гурткі па вывучэньню гісторыі ЛКСМБ. Заняткі, асабліва ў стацыянарцы, праходзяць жвава. Кепска абстаіць справа з рабочай і сялянскай моладзьдзю, якую ня прымаюць у гурткі, мотывуючы тым, што «адзін кіраўнік ня справіцца». Гэты недахоп трэба сваечасова зьнішчыць.

Наогул вучоба ідзе вельмі жвава і цікава. Мэтад пабудован на актыўнасьці і самадзейнасьці комсамольцаў. Кожнае пытаньне, раней чым кіраўнік дасьць вывад, абгаварваецца ўсім колектывам. Асабліва зацікавіла і выклікала масавыя спрэчкі пытаньне аб тым, ці кляса—сялянства, як разумець дыктатуру пролетарыяту ва ўмовах пераважнасьці сялянскіх гаспадарак?

Вялікі недахоп яшчэ ў тым, што мала падручнікаў. Праўда, мы зьбіраемся колектыўна, прапрацоўваем заданьні па аднаму падручніку. Але гэта значна перашкаджае ў працы.

М. Бялько.

Кожны вечар за кнігай.

(Рэчыца).

У гэтым годзе наглядаецца вялікая цяга да вучобы сярод рабочай моладзі. Адной толькі вячэрняй школай ахоплена 325 чалавек. Шмат рабят займаюцца ў палітшколах і партшколах.

У горадзе адчыніліся яшчэ дзьве вячэрнія школы. На фабрыцы «Днепр» ужо працуюць вячэрнія і палітшколы. Ня гледзячы на вялікую колькасьць школ, маецца яшчэ ня мала маладняка, які нідзе ня вучыцца.

Трэ было-б ячэйкам арганізаваць для гэтай часткі моладзі гурткі

Стольбэрг.

35 чалавек і 1 кніжка.

(Мястэчка Бярэзіна, Меншчына)

Заняткамі ў палітшколах наша моладзь вельмі зацікаўлена. Ёсьць школы, у якіх займаецца па 30-35 чалавек.

Дрэнна толькі тое, што на гэты лік слухачоў маецца ўсяго адна кніжка, і акрамя таго, кіраўнік таксама адсутнічае, што перашкаджае наладзіць працу ў школе.

Хаўцэвіч.

„Хто такі Чарвякоў?—ня ведаем".

(Магілеўскі Белпэдтэхнікум).

Як толькі зьехаліся комсамольцы ў тэхнікум—ячэйка ажывіла працу. Зараз-жа для азнаямленьня з нова-прыбыўшымі комсамольцамі першага курсу, бюро заслухала кожнага комсамольца аб яго працы, палітычным разьвіцьці і інш. Гэта рабілася ў мэтах дачы яму пасільнай працы.

З палітправеркі комсамольцаў АПА камісіяй ячэйкі выявілася, што частка комсамольцаў зусім не разьбіраецца ў бягучым палітычным і грамадзкім жыцьці. Былі выпадкі, калі «Народны Камісар Унутраных і Ўнешніх Спраў зьяўляўся Чарвякоў», ня ведалі комсамольцы колькі ў СССР усіх саўнаркомаў і г. д.

Былі створаны 3 гурткі: гурток сучаснасьці, які прапрацоўваў матар'ял па газэтах, яго наведвалі комсамольцы і студэнты першага курсу. Другі гурток працаваў па газэце «Правда». І трэці гурток, куды ўваходзілі студэнты старэйшага курсу, прапрацоўваў матар'ялы па часопісі «Бальшавік».

Гурткі добра дапамаглі студэнтам быць у курсе сучаснага палітычнага жыцьця.

Ул. Суніца.

Дайце памяшканьне!

(Ворша).

Ужо каля двух месяцаў працуе наша комсамольская палітшкола, але добрага памяшканьня ўсе яшчэ няма. Гурткоў у нас больш чым 12, а пакояў дзеля заняткаў усяго 4. Асьвятленьне ў клясах надта дрэннае і слухачы псуюць свае вочы.

Акругком, зьвярні ўвагу!

БЕЛІЦКАЯ ЯЧЭЙКА.

(Сеньненскі раён).

Ячэйка організавана ў 1925 годзе. У 26 годзе ячэйка адчыніла лікпункт, які ўтрымоўвала на свае сродкі поўнасьцю і навучыла грамаце 19 асоб. Для лікпункта ячэйка самастойна выпісвала газэты і іншую літаратуру. Пры рабачкоме ў клюбе ячэйка адчыніла куток «ПН».

Дзякуючы бюро ячэйкі па Беліцкаму сельсавету ў гэтым годзе працавала 2 лікпункты. Усяго на лікпунктах навучана 52 чалавекі. Акрамя гэтага індывідуальна навучана 12 асоб. Беліцкая ячэйка «ПН» здала ў райсаюз 45 рублёў.

Уся праца ячэйкі асьвятляецца ў насьценнай газэце.

Мы засталіся пераможцамі!

У цёмных сутарэньнях касьцёлу сустрэлі калядны толькі адны старыя, ды невялічкая частка моладзі.—З вясельлем, песьнямі, гармонікам, на каньках і лыжах—правёў працоўны маладняк Менску гэтыя калядныя вечары.—З комсамолам вялікая частка моладзі. Мы засталіся пераможцамі.

У касьцеле пад гукі аргану

Сталіца рыхтавалася да каляд...

Яна была ахоплена віхурай сьвяточнай мітусяніны, вясёлым і нецярплівым чакаючым настроем, які панаваў у звычайна сухіх і будніх абставінах гораду.

Два фронты, бязьлітасныя адзін да другога, чакалі каляды. Два фронты—ячэйкі, клюбы, гурткі, фізкультурнікі—касьцёлы, сэктанты і некаторыя царквы.

Хто з іх застаўся пераможцам?

На вечарох, на глухой Трубнай вуліцы, у цёмным завулку, дзе рэдка, рэдка хто пройдзе, у доміку касьцёльнага вартаўніка зьбіраўся штаб менскіх каталікаў.

Хто з нас ня ведаў, што яшчэ за некалькі тыдняў да каляд яны распачнуць падрыхтоўку. Ціхую, захаваную, абдуманую, па іезуіцку заблытаную падрыхтоўку. І вось вынікі. «Божа нарадзэньне» і хор з моладзі.

Надзвычайна патрасаючая рэч для богаверных каталікаў гэта «божа нарадзэньне». Уявеце сабе тускла асьвятляемае, сырое, зялёнае ад вільгаці сутарэньне, паўсьвет ад лямпад, падаючы на вылучаючыя абсахшыя твары волхваў, радуга квітнеючая ля галавы гіпсавага Ісуса, ляжачага ў драўляных ясьлях, цішыня, шалёны шопат фанатычак, шорах чотак і ледзьледзь чутныя гукі аргана, выючага дзесьці далёка на гары касьцёлу. Тут побач з ясьлямі, як канчатковая мэта ўсёй камэдыі, стаіць ваза для грошай, якія павінны ахвяраваць Ісусу волхвы і... каталікі.

Раней іх зьбіралі шмат. Цяпер крыху менш, але ўсё-ж ня мала.

Ксяндзоўскія прыслужнікі—хлапчукі, разадзетыя ў сутаны і чырвоныя палярыны, насьмешліва зявалі ў натоўп, потым спрытна хваталіся за званік пры ўваходзе ксяндза. Скольні было моладзі? Ня цэлы дзесятак. Хор складаўся з маледых дзяўчат.

У клюбе, на катку, з гармонікам.

Хоць і была моладзь у касьцёле, хоць касьцёлы і былі ўпрыгожаны рознакалёрнай паперай, а ўсё-ж такі ў нас было больш людзей.

Няхай аб гэтым раскажуць клюбы і каткі, у якіх весяліўся комсамольскі Менск на каляды. Ноч ціхая, пярухомая, калядная ноч, ніколі ня ведаўшая такога вясельля, няхай яна аб усім раскажа.

Пачалося з таго, што па акраінах гораду, дзе за замшэлымі стаўнямі домікаў, пад пераліўы гармонікаў гудзелі людзі ў п'яным чадзе—тады ціха шурша з лёгкім прысьвістам несьліся па сьвежавыпаўшым сьнегу лыжнікі. А потым з песьнямі, з крыкамі, з жартамі ехалі зноў назад у горад, у клюбы.

Цікавей за ўсё было ў польскім клюбе. «Чырвоная Заля» не ўмясьціла ўсіх жадаўшых папасьці на вечар польскай моладзі. У «Чырвонай Залі» сабралося бадай што каля 1000 чалавек. Тут былі і палякі, і беларусы, і яўрэі, і як-та ўсе сьмяяліся разам, разумеючы п'еску на польскай мове, рагаталі з ксяндзоў і папоў—пэрсанажаў п'ескі.

А колькі цудоўнай бадзёрасьці і неабдымнай вясёласьці ўнесьлі выступленьні балетнага гуртка клюбу «КІМ». Тысячнай залі так і хацелася скакаць разам з дзьвюма комсамолкамі, якія выконвалі новы піонэрскі танец. А каўказкія плаські, піраміды, яўрэйскія скокі і нарэшце колькі захапленьня выклікалі нацыянальныя польскія танцы.

Так весялілася польская моладзь.

Мы ледзь-ледзь выбраліся з клюбу, і сьпяшаліся далей.

Клюб чыгуначнікаў імя Леніна.

Мы прышлі, калі вечар быў у распале. Клюб перапоўнен, нам гавораць, што столькі людзей ніколі ня было. Тут ужо адбылася інсцэніроўка, даклад, гульні, цяпер пачаліся скокі. Цікава, не танцаваўшых амаль што ня было. Хуліганаў і п'яных таксама ня было, хаця буфэт з півам быў увесь час адчынены.

У клюбе шмат моладзі ня чыгуначнай. Гэта акраіна, пакінуўшая дом п'янкі, касьцёлы і царквы, гэта акраінная моладзь, прышоўшая ў клюб. Яна адчувае сябе вольна, хаця і весяліцца першы раз. Юнсэкцыя добра разрэклямавала вечар. Былі аб'явы, віселі доўгія плякаты пры ўваходзе.

Чыгуначнікі зрабілі два вечары напярэдадні і ў першы дзень, абодвы вечары былі перапоўнены, на абодвых вечарох была моладзь.

У хімікаў, тэкстыльшчыкаў, будаўнікоў, ува ўсіх былі вечары да раньня. Яшчэ далёка да клюбу чуліся калыханьні оркэстраў, вясёлы ўрачысты гул, ускрыкі і адгалоскі песьняў.

На катку адміністратары з ухмылкай гаварылі, што не хапала канькоў і санак. Адміністратары гаварылі, што 200 чалавек ў гэтую ноч рэзала бліскучай стальлю сваіх канькоў зялёны лёд катка. Позна ноччу оркэстр зачыніў каток маршам, патухлі рознакалёрныя ланцужкі агней і вялікія ліхтары.

* * *

Другі дзень быў ужо бліскучай дэманстрацыяй нашай перамогі. Раніцай пайшлі на лыжах амаль што ўсе фізкультурныя гурткі гораду. Раніцою а 10-й гадзіне на катку ўжо гулялі піонэры і школьнікі. Вечарам весяліў чырвонаармейскі гармонік, праходзіў гарнізонны конкурс гарманістых.

... Вечарам зноў успыхнулі агні клюбаў, зноў загрукаталі оркестры, закружыліся пары, панесьліся канькабежцы па ледзяных колах... Успыхнулі і патухлі агні. Каляды закончыліся.

— Мы засталіся пераможцамі.

Ал. Каліта.

ЦКК КПБ—аб справе Казлоўскай.

29-га кастрычніка ў нашай газэце былі зьмешчаны матар'ялы аб самазабойстве комсамолкі Казлоўскай на шклозаводзе „Комінтэрн" і наогул аб наліччы шэрагу адмоўных момантаў на гэтым заводзе.

Абмаляваўшы тыя немагчымыя ўмовы працы і жыцьця рабочых на шклозаводзе (п'янства, хуліганства, палавая распуста, дрэнныя абыходзіны майстроў з вучнямі, маладых рабочых з работніцамі), у выніку якіх атруцілася Казлоўская, рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" патрабавала з боку адпаведных органаў безадкладнага расьсьледваньня гэтай справы і прыцягненьня ўсіх вінаватых да адказнасьці.

У дрэнных кватэрных умовах вінен Беларускі Шклотрэст.

Яшчэ да зьмяшчэньня артыкулаў некаторых адказных партыйных, савецкіх працаўнікоў Бабруйская АКК КП(б)Б вылучыла спэцыяльную камісію дзеля расьсьледваньня фактаў, апісаных у „Ч. З." ад 29 кастрычніка, якая зараз-жа прыступіла да працы.

Перш за ўсё камісія зьвярнула ўвагу на кватэрныя і бытавыя ўмовы жыцьця рабочых. Устаноўлена, што звыш 65 рабочых, ня лічачы іх сем'яў, жывуць у зусім няпрыгодных і распаўшыхся кватэрах.

Інтэрнаты, у якіх зьмяшчаюцца астатнія рабочыя, адзначаюцца нязвычайнай цеснатой і зусім не адпавядаюць свайму прызначэньню з санітарнага і гігіенічнага бакоў.

Устаноўлена, што ў гэтым цалком вінаваты Беларускі Шклотрэст, які згодна колдагавору павінен быў пабудаваць да 1-га верасьня 1927 г. некалькі інтэрнатаў і свайго абязацельства ня выканаў.

Чаму атруцілася Казлоўская.

На запытаньне аб прычынах самазабойства Казлоўскай, камісія атрымала яўна працівалеглыя адказы. Комсамолец Пінчук кажа, што «ніякіх прасьледваньняў і зьдзекаў ня было, яна атруцілася толькі з маркоты па сваёй няпрывабнай фігуры».

Другі комсамолец Васьпітаньнікаў аказаўся больш шчырым. З ухмылкай на вуснах кажа, што многія рабочыя, у тым ліку і сам ён, часта „ціскалі" Казлоўскую, супроць чаго яна не протэставала. Мы нічога дрэннага ў гэтым ня бачылі,—з нявінным выглядам заключае ён.

Але побач з такімі размовачкамі мы маем яшчэ цэлы шэраг водгукаў ад рабочых і работніц аб сапраўдных прычынах самазабойства. Рабочыя Гэршанаў, Анкудовіч ды іншыя гавораць, што „Чырвоная Зьмена" зусім правільна абмалявала становішча, падцьвярджаюць, што Казлоўскую зацкавалі, давялі да атруты сваімі нячулымі і нечалавечымі адносінамі.

Як рэагавалі партыйная і комсамольская ячэйкі.

Сход комсамольскай ячэйкі заводу „Комінтэрн", абмеркаваўшы выпадак з самазабойствам, прыняў пастанову, у якой адзначае, што сама ячэйка вінавата ў тым, што не змагла папярэдзіць гэты выпадак.

Ячэйка лічыць грунтоўнай прычынай, якая штурхнула Казлоўскую да самазабойства адсутнасьць таварыскіх адносін да яе з боку комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Ячэйка прызнае, што не вяла ніякай культасьветнай работы і лічыць неабходным у далейшым павесьці сыстэматычную работу па папярэджваньні такіх фактаў.

Прыблізна такую-ж пастанову вынес і агульны сход рабочай моладзі заводу, які констатаваў, што сярод яе маецца шэраг нездаровых зьявішчаў: п'янства, гульня ў карты, распуста і інш. Сход падкрэсьліў, што Казлоўскую можна было-б выратаваць ад самазабойства, калі-б ня было ненармальнасьцяў у жыцьці моладзі.

Заўком на гэты выпадак зусім не рэагаваў. Старшыня заўкому кажа, што наогул нічога ня ведаў аб Казлоўскай і пачуў аб ёй першы раз ужо пасьля самазабойства.

Што пастанавіла Бабруйская АКК і ЦКК КПБ.

Такім чынам устанавіўшы, што факты апісаныя ў «Чырвонай Зьмене» адпавядаюць сапраўднасьці, Бабруйская АКК вынесла па гэтай справе шэраг вывадаў і конкрэтных прапаноў.

Пастаўлена пытаньне перад адпаведнымі органамі аб неабходнасьці зьняцьця з працы кіраўніка заводу, старшыні заўкому, узмацненьня на заводзе партыйнай, комсамольскай, профэсыйнай і культасьветнай работы на прадпрыёмстве.

Даручана акруговаму пракурору павесьці расьсьледваньне на заводзе па сваёй лініі і прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці, стварыўшы на заводзе паказальны працэс.

Справа комсамольцаў, якія дазволілі сабе хуліганскія выхадкі да Казлоўскай, вылучана асобна, дзеля прыцягненьня да саюзнай адказнасьці канфліктнай камісіяй АКЛКСМБ.

Прэзыдыум ЦКК КПБ на сваім апошнім пасяджэньні ўсе гэтыя прапановы зацьвердзіў і, акрамя таго, ухваліў прыняць меры праз праўленьне Шклотрэсту аб ліквідацыі на заводзе кватэрнага крызісу.

Усе гэтыя пастановы даюць упэўненасьць, што завод „Комінтэрн" больш ня будзе месцам п'янак, хуліганства і самазабойстваў. Аб гэтым яшчэ сьведчыць рэзолюцыі сходаў комсамольскай ячэйкі і завадзкой моладзі з шчырым прызнаньнем сваёй віны і імкненьнем зьнішчыць усе ненармальнасьці, якія дагэтуль назіраліся.

Міжнародны агляд.

Дзень за днём.

Як была зьнішчана савецкая ўлада ў Кантоне.—Выкрыцьцё прадажніцтва кітайскай рэволюцыі.—Здрадніцтва ня можа зьнішчыць рэволюцыю.—Англія перад абвастрэньнем клясавае барацьбы.

Як быў разгромлен чырвоны Кантон.

Ужо зараз на падставе розных вестак можна даць наступны малюнак барацьбы за Кантон.

11-га сьнежня Кантон быў заняты рабочымі і сялянамі, якія паўсталі і выкарысталі барацьбу між генэраламі, уладаўшымі кантонскай провінцыяй.

Была абвешчана ў Кантоне ўсеагульная забастоўка.

Паўстаўшыя рабочыя і сяляне захапілі бюро грамадзкага парадку і паліцэйскія вучасткі.

Паліцэйскія былі разброены, усе палітычныя вязьні выпушчаны на вуліцу і далучыліся да паўстаўшых.

Потым паўстаўшыя занялі ўрадавыя будынкі і цэнтральны банк.

Быў створаны новы рэволюцыйны ўрад.

Комуністычная партыя прыступіла да выданьня газэты «Чырвоны Сьцяг».

«Конфіскацыя банкаў, бірж, вялікіх магазынаў і вялікіх дамоў для перадачы іх рабочым, зварот прысуджаным волі, свабода забастовак»—вось што было абвешчана рэволюцыйным урадам.

Гэта было 11 сьнежня. Але 12 сьнежня пачалася барацьба між рэволюцыйнымі рабочымі і сялянамі і контр-рэволюцыйнымі генэраламі.

Бюро грамадзкага парадку ня раз пераходзіла з рук у рукі. Урэшце перамаглі рэакцыянэры.

Цэнтральны банк быў зьнішчаны пажарам, які ўзьнік у выніку гарматнае страляніны.

Арышты і пакараньні сьмерцю.

У гэтыя-ж дні былі арыштаваны пяць савецкіх грамадзян, якіх потым забілі. Сярод забітых, як відаць, быў і савецкі консул Хасіс.

З большай часткі паведамленьняў відаць, што савецкае консульства было захоплена 15-га сьнежня, зусім абрабована і занята войскамі. Пэрсанал консульства быў арыштаваны і пасаджаны ў памяшканьні бюро грамадзкага парадку.

Пакараньні сьмерцю ў Кантоне пачаліся 13-га сьнежня. Усяго да гэтага часу пакарана сьмерцю звыш 2 тысяч чалавек.

Цень Чэмберлена ў Кітаі.

У Кантоне разбурана прыблізна тысяча дамоў. Зараз-жа пасьля задушэньня паўстаньня распачалася кампанія супроць СССР.

Кампанія пачалася на падставе таго, што быццам «нейкі расійскі комуніст па прозьвішчы Іоўшаў, які нядаўна прыехаў у Кантон, кіраваў усім рухам», быццам «савецкі консул камандаваў паўстанцамі».

Вось на падставе якіх абвінавачваньняў, контр-рэволюцыйныя генэралы паднялі па ўсім Кітаі супроцьсавецкую кампанію.

За сьпіною кітайскіх рэакцыянэраў, якія вядуць барацьбу супроць СССР, стаіць ангельская буржуазія.

У высылцы савецкіх прадстаўнікоў з Кітаю, Англія бачыць лепшы шлях зьнішчэньня нашага ўплыву ў гэтай краіне.

Але СССР для рэволюцыйных кітайскіх мас застаецца, як і раней, вялікім прыкладам і крыніцай баявых натхненьняў.

Выкрыцьцё прадажніцтва інтарэсаў рэволюцыі.

12 сьнежня ўдава вядомага кітайскага рэволюцыянэра Сун-Ят-Сэна, Сун-Цзін-Лін наслала Чан-Кай-Шы наступную тэлеграму:

„Якраз перад тым, як я зьбіралася вярнуцца на бацькаўшчыну, я даведалася аб вашым пляне спыніць зносіны з Савецкай Расеяй і патрабаваць адкліку савецкіх консульстваў. Калі гэты крок будзе ўжыты, дык ён будзе самагубным: ён ізалюе Кітай і прыпыніць яго разьвіцьцё.

Адказнасьць за гэтае гісторыя ўскладзе на вас.

Калі вы маеце хоць частку дальнабачнасьці вашага правадыра, і калі вы памятаеце, што супрацоўніцтва з Савецкаю Расеяй было яго апошняю воляю, дык вы становіцеся перад бяздоньнем, у якое вы ўцягнеце за сабою ўвесь край.

Я застаются тут у знак пратэсту проці вашае пастановы, калі толькі ў апошні момант ня будуць ўжыты меры да папярэджаньня разрыву.

Я думаю, што вашыя беспадстаўныя «крыўды» маглі-б быць пагоджаны шляхам мірнае згоды з Савецкаю Расеяю.

Адказ здрадніка рэволюцыі.

Чан-Кай-Шы адказаў Сун-Цьзін-Лін наступнаю тэлеграмаю:

«Вашую тэлеграму ад 19-га сьнежня атрымаў.

Мы бяром на сябе поўную адказнасьць за гэты крок разрыву дачыненьняў з Савецкаю Расеяю, агенты якое толькі нядаўна зрабілі з Кантону ахвяру; але мы просім вас устрымацца ад меркаваньняў да прыезду сюды і ўласнага азнаямленьня з становішчам.

Усе мы прытрымліваемся таго пункту гледжаньня, што, паколькі вы зьяўляецеся лёйяльным членам Гоміндану, вашая тэлеграма і ваш далейшы пабыт у Расеі ня могуць быць дабраахвотнымі, і што вы маглі-б зрабіць больш для партыі, калі-б выклалі вашыя думкі ўласна, а не пад прымусам.

З нецярплівасьцю чакаем вашага хуткага звароту».

„Калі парашу зьярнуцца, дык толькі з мэтаю далучыцца да барацьбы рабочых і сялян".

23-га сьнежня Сун-Цьзін-Лін тэлеграфавала ў Шанхай Чан-Кай-Шы адказ на яго тэлеграму, у якім гаворыць:

Мой пабыт у Маскве—сэрцы сусьветных рэволюцыйных сіл—зьяўляецца дабрахвотным, таксама як і факт майго прыезду зьяўляецца дабрахвотнымпратестам проці контр-рэволюцыйнае палітыкі гаміндапаўскага кіраўніцтва.

Калі я выступіла зараз перад тварам разрыву дзяржаўных дачыненьняў з адзінаю антыімпэрыялістычнаю дзяржаваю, дык я зрабіла гэта таму, што лічыла сваім абавязкам зрабіць перасьцярогу ў рашаючым пытаньні, закранаючым кожнага сумленнага нацыяналіста.

Я-ж ня ведала, ці зьяўляецца патрэбаваньне аб разрыве дачыненьняў з Савецкаю Расеяю вашым уласным рашэньнем, ці рашэньнем тых гнілых элемэнтаў, якія вас абкружаюць, на якіх вы ня раз скардзіліся, і якім вы зараз дазваляеце канчаткова і раз назаўсёды вас загубіць.

Адначасна з разрывам дачыненьняў з Савецкай Расеяй, падтрыманьне прыязьні з якою было палітыкаю, цьвёрда выказанаю, ў тэстамэнце Сун-Ят-Сэна, вы аднак ня маеце намеру парваць дачыненьні з імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Мала таго, орган, у сучасны момант прэтэндуючы на назву выканкому Гоміндану, зрабіўся супольнікам імпэрыялістаў, а гоміндапаўскія лідэры, і ў тым ліку вы, падтрымліваеце шчыльную сувязь нават з начальнікам карных экспэдыцыйных корпусаў, накіраваных у Кітай, як колёніяльны край.

Калі я парашу зьвярнуцца, дык толькі з мэтаю далучыцца да барацьбы рабочых і сялян, для шчасьця якіх Сун-Ят-Сэн ахвяраваў 40 гадоў жыцьця і якіх зараз забівае азьвярэўшая рэакцыя, пахабна прыкрываючы свае ўчынкі сьцягам Гоміндану.

З тае вышыні, на якую ўзьняў нашую рэволюцыю наш незабываемы правадыр, дзякуючы дапамозе рэволюцыйных сіл усяго сьвету, вы прынізілі яе, даўшы магчымасьць ёй абярнуцца ў зброю для агідных дробных мілітарыстаў, якія на словах нібы шануюць Сун-Ят-Сэна.

Я іду па шляху рэволюцыі, гэта адзіны шлях, ідучы па якім можна шанаваць памяць нашага правадыра, і з гэтага шляху я ня зыйду.

Здрадніцтва для нашае рэволюцыі ня нова, здрадніцтва разьбіла сэрца нашаму правадыру, але яно ня можа зьнішчыць рэволюцыю».

Англія перад абвастрэньнем клясавае барацьбы.

Ангельскія тэкстыльныя фабрыканты прыступілі да новага скарачэньня зарплаты і павялічэньня рабочага дню.

У ангельскай вугольнай прамысловасьці становішча яшчэ больш пагаршаецца.

Усё больш і больш расьце беспрацоўе. І як вынік ўсяго гэтага, растуць рэволюцыйныя настроі сярод рабочых мас.

Паказальнікам гэтага росту зьяўляецца посьпех комуністых на выбарах у органах профсаюзаў, а таксама і протэст супроць разрыву з Савецкім Саюзам.

Ангельская буржуазія стаіць напярэдадні новых клясавых сутычак з рабочымі.

Алёнін.

Да новых дасягненьняў і перамог.

На комсамольскай конфэрэнцыі Кастрычнікавага раёну

Дзелавая кароценькая была абвестка дню конфэрэнцыі.

Сакратар райкому Карняеў адчытваўся за шасьцімесячную працу раённага камітэту. Ён гаварыў, што ячэйкі, асобныя комсамольцы зразумелі важнасьць гаспадарчай працы, важнасьць удзелу ў ёй.

Дасягненьні асобных ячэек, служаць бліскучым доказам гэтага. З 20 ячэек налічваемых у раёне 5 савецкіх.

Вось прыклад іхняй працы.

Ячэйка Дзяржбанку праводзіла вечары з конкурсам на лепшага канторшчыка. Вечары далі тое, што некалькі комсамольцаў пераведзены на лепшы разрад, некаторым далі прэміі.

Комсамольцы Прамбанку рэорганізавалі экспэдыцыю, рэорганізавалі адтрыманьне зарплаты ўвёўшы картачную сыстэму, усё гэта дало экономію каля 1000 рублёў у год.

Комсамольцы Белсельбанку ўвялі шэраг новых прыёмаў бухгальтэрыі, унесьлі прапановы аб скарачэньні некаторых аддзелаў.

Так дзень за днем у канцлярыях і канторах комсамольцы змагаліся за паляпшэньне апарату, за зьнішчэньне бюрократызму і валяніты ў савецкім апараце.

На рабочых ячэйках, якія складаюць асноўны асяродак організацыі, таксама, як і ў савецкіх ячэйках, ёсьць вялікія і радасныя дасягненьні ў галінах вытворчай працы і дысцыпліны.

На гуце „Пролетары", напрыклад, хлапцы дамагліся, каб фабрыкаты, якія яшчэ не закупленыя не пакавалі, бо псуецца і рвецца рагожа, якая ўжываючыся ў вялікай колькасьці складае значную суму.

Хлапцы з настойлівасьцю правялі прапанову аб вучоце інструмэнтаў, і шэраг яшчэ маленькіх на першы погляд нязначных прапаноў, але якія ў вытворчасьці мелі вялікае значэньне.

Чыгуначнікі значна паднялі вытворчую дысцыпліну, няма прагулаў, не наглядаюцца няўважлівыя адносіны да варштату. У колектыве ня было ніводнага опозіцыянэра, ня было ніводнага опозіцыйнага выступленьня. Кастрычнікаўскі заклік знайшоў у раёне вялікае падтрыманьне. Аб гэтым гавораць 50 комсамольскіх білетаў, якія атрымалі лепшыя маладыя рабочыя раёну.

Комсамольцы Кастрычнікавага раёну—і кіраўнікі нашага гораду. Члены горсавету, комсамольцы, сярмяжка, нам. старшыні сэкцыі РСІ і дзяўчына з гуты «Пролетары» выкрылі, працуючы ў сэкцыі РСІ, шэраг недахопаў і ўпушчэньняў па шмат якіх установах Менску.

Конфэрэнцыя насіла дзелавы характар, у спрэчках выказалася па справаздачы райкому—14 чалавек, па справаздачы акругкому—21 чалавек.

Конфэрэнцыя заслухала інформацыю тав. Перапечкі аб XV парт'зьезьдзе. Організацыя прышла да конфэрэнцыі моцнай і згуртаванай, гэта і адчувалася ва ўсіх спрэчках, прапановах і пытаньнях.

А. К.

У госьці да маракоў

Заўтра, 1-га студзеня з Менску выяжджае на падшэфны лінкор дэлегацыя ячэйкі Белдзяржунівэрсытэту ў складзе 45 чал.

Экскурсію да маракоў дружна падтрымала ўсё студэнцтва БДУ. Шмат комсамольцаў едзе на экскурсію за свой кошт.

Ячэйкай БДУ таксама сабрана 320 руб. для закупкі падарункаў чырвонафлётцам падшэфнага ячэйцы кубрыка лінкору „Парыская Комуна". Сярод падарункаў: двухрадны гармонік, вельмі альбом са здымкамі і дыяграмамі жыцьця і працы Унівэрсытэту, бібліотэчка, фото-апарат і грамафон.

У Ленінградзе дэлегацыя пабудзе некалькі дзён. **На лінкоры ёю будзе наладжаны вялікі вечар беларускага мастацтва для маракоў.**

Акрамя гэтага ячэйка БДУ сабрала 100 рублёў, на якія ёй будуць закуплены ў Ленінградзе матарыялы для абсталяваньня ва ўнівэрсытэце вайскова-марскога габінэту.

Разам з дэлегацыяй БДУ на „Парыскую Комуну" выяжджае дэлегацыя ячэйкі архітэктурна-дарожна-будаўнічага тэхнікуму ў складзе трох чалавек.

М. З.

У тры радкі.

— Вядзецца падрыхтоўка да раённых зьездаў саветаў Менскай акругі, якія адбудуцца паміж 5 і 20 сакавіка.

— Наркамасьветы асыгнаваў 87 тысяч рублёў на набыцьцё абсталяваньня і розных прылад для профшкол і тэхнікумаў БССР.

— 1-га сакавіка 1928 г. ў Менску скліканецца ўсебеларускі зьезд камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

— Наркамзем ухваліў прадставіць у дармовае карыстаньне беднейшаму сялянству 2.550 дзесяцін сенажаці ў розных акругах БССР.

— У пачатку студзеня 1928 г. прыяжджае на гастролі ў Менск трупа яўрэйскага дзяржаўнага тэатру пад кіраўніцтвам Рафальскага.

— Наркамахоўздароўя ўхваліў прыраўняць студэнтаў ВНУ у адносінах атрыманьня імі мэдыцынскай дапамогі да застрахаваных членаў профсаюзаў.

— У Менску адчыняюцца курсы для падрыхтоўкі сакратароў ячэек Мопр'у, куды будзе прынята 60 чалавек.

— 1—10 студзеня ў БССР будзе праводзіцца кампанія сьвяткаваньня 8-мігадовага юбілею са дню выданьня дэкрэту аб ліквідацыі няпісьменнасьці.

— Гэтымі днямі пачынаюцца заняткі на курсах санітарак пры „Чырвоным Крыжы", куды прынята 105 асоб.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Рыхтуемся да зьезду ЛКСМБ. Для падрыхтоўкі да 9-га ўсебеларускага зьезду комсамолу бюро ЦК ЛКСМБ выдучыла камісію ў складзе 7 чалавек.

У камісію ўваходзяць наступныя таварышы: **Галавач** (старшыня), **Курцік, Салцэвіч, Шнэйдэр, Плучык, Лабадаеў і Харытановіч.**

„Чырвоная Зьмена" дае справаздачу. ЦК ЛКСМБ ухваліў дапоўніць парадак дню акруговых комсамольскіх конфэрэнцый у Менску, Віцебску, Магілеве і Гомелі справаздачай рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена".

Цэнтральны піонэрскі габінэт. Пры ЦБ ЮП організован і распачаў сваю працу цэнтральны габінэт піонэрруху, у якім маецца шмат літаратуры па пытаньнях працы атрадаў і школ.

Габінэт будзе даваць спраўкі піонэрправаўнікам як Менску, так і іншых акруг па ўсіх пытаньнях працы з дзяцьмі.

Наш удзел ва ўсесаюзнай спартакіядзе. ЦК ЛКСМБ абмеркаваў пытаньне аб удзеле фізкультурнікаў БССР ва ўсесаюзнай зімовай спартакіядзе, якая адбудзецца 2-га лютага 1928 году.

Ухвалена паслаць на гэтую спартакіяду каманду з 33 чалавек, у склад якой увойдуць лыжнікі, канькабежцы, ігракі па хакэю ды інш.

Конфэрэнцыя Менгарраёну ЛКСМБ. 31-га сьнежня распачне сваю працу конфэрэнцыя Менскай гарадзкой комсамольскай організацыі, на якой будзе прысутнічаць каля 400 дэлегатаў.

На павестцы дню конфэрэнцыі стаяць: **даклад аб выніках 15-га зьезду ЎсеКП(б), справаздача акругкому ЛКСМБ, справаздача райкому і выбары.**

Што новага у БДУ.

Зьмены ў прынцыпах прыёму.

Наркамасьветы вызначыў новыя прынцыпы прыёму студэнтаў у БДУ, ў 1928-29 вучэбным годзе.

У адрозьненьне ад мінулых гадоў **прыём студэнтаў будзе рабіцца на кожным факультэце асобна спэцыяльнай камісіяй.** Летась прыём рабіўся на ўсе факультэты адной агульнай камісіяй.

Устаноўлены вольны пераход для студэнтаў не стыпэндыятаў на іншыя факультэты і вышэйшыя навучальныя ўстановы. У выпадку прыёму ў іншую навучальную ўстанову студэнта, ён можа быць зноў залічан на ранейшае месца вучобы пры наяўнасьці вольнай вакансіі.

Замежныя камандыроўкі.

Для павышэньня кваліфікацыі навуковых працаўнікоў і ўстанаўленьня цеснай сувязі паміж імі і вучонымі замежных краін, праўленьне БДУ вызначыла наладзіць у 1928 г. 33 замежныя камандыроўкі, аб чым узьнята адпаведнае хадайніцтва перад Наркамасьветай.

Камандыроўкі маюць адбыцца ў Нямеччыну, Францыю, Чэха-Славакію і інш.

Маніфэст ажыцьцяўляецца.

Беднякі вызваляюцца ад падатку.

Мезакрфа правёў значную працу па прадстаўленьню бядняцкім і сераднякацкім гаспадаркам фінансава-падатковых ільгот.

Зволена часткова або поўнасьцю ад сельгаспадатку 48.266 гаспадарак на агульную суму 226 тысяч рублёў. Зьняты падатковыя нядоімкі мінулых гадоў з 4.677 двароў.

Гэтыя ільготы даюць магчымасьць незаможным гаспадаркам значна ўзмацніць сваё матар'яльнае становішча.

Дапамога беднаце.

Па БССР заканчваецца кампанія перавыбараў камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

Згодна папярэдніх вестак, справаздачна-перавыбарчыя сходы сялян-членаў КСУ прайшлі надта актыўна. Нова-абраным камітэтам дадзены наказы аб павялічэньні дапамогі беднаце **шляхам організацыі машынных насенных і іншых таварыстваў,** крэдытаваньні і коопэрыраваньні бяднейшага насельніцтва і г. д.

Вёска машынамі будзе забясьпечана.

ВСНГ зацьвердзіў плян вытворчасьці сельска-гаспадарчых машын і прылад мэталё-заводамі БССР у 1927-28 г.

Згодна пляну павінна быць зроблена за гэты год на беларускіх заводах **звыш 7 тысяч плугоў,** каля 5 **тысяч сячкарань, 10 тысяч** веялак ды інш. Такім чынам да наступнага году беларускі рынак **будзе забясьпечаны сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі сваёй вытворчасьці.**

* * *

Да вясеньняй пасяўной кампаніі Белсельсаюз і Цэнтразямсклад загатаўляюць для ачысткі насеньня 8200 машын, якія будуць прывезены з-за граніцы.

На набыцьцё гэтых машын адпушчана 445 тысяч рублёў.

66 комсамольцаў—старшынь сельсаветаў.

Згодна вестак цэнтральнай выбарчай камісіі пры ЦВК БССР, у складзе комсамольцаў—старшынь сельсаветаў налічваецца 66 чалавек.

З гэтага ліку па Віцебскай акрузе мы маем 16 комсамольцаў старшынь сельсаветаў: Аршанскай—15; Менскай—9; Бабруйскай—9; Мазырскай—6; Гомельскай—5, Полацкай—5 і Магілеўскай—3.

Фото-вакно „Чырвонай Зьмены".

На нашым здымку зьвяно кітайскіх піонэраў. Зараз іх організацыя разбурана і затоплена ў крыві. Аб піонэрах агіднейшы са здраднікаў Гаміндану Ван-Цін-Вэй, сказаў: „Зьнішчаць трэба ўсіх, нават моладзь, вінную толькі ў выказваньні гарачых прамоў".

Школа фабзавуч імя Камо ў г. Тыфлісе (Грузія). На здымку—фабзайчаты ў ліцейнай майстэрні.



У сьнежні па ўсім Саюзе праводзіліся заняткі з дапрызыўнікамі 1906 году. На здымку—дапрызыўнікі ля гарматаў на занятках у Таганроскай акрузе на Украіне.

„Дынама" гандлюе.

Скардзяцца менскія фізкультурнікі на адзіны існуючы ў Менску магазын спортпрылад—«Дынама». У чым-жа справа?

— Гэты магазын прадае лыжы па 16 рублёў з капейкамі пара. Акрамя саміх лыж, у гэтую цану ўваходзіць таксама кошт усіх астатніх прылад, як кіі, рамні, гумкі ды інш.

Пры продажы лыж з пакупцоў узялі грошы за ўсе вышэйназначаныя прылады, **а выдалі толькі адны лыжы** і... больш нічога.—У нас, кажуць, пакуль што **няма гумы і рамнёў,** але прыходзьце праз два дні, іх можна будзе атрымаць.

Чытач ужо пэўна дагадваецца, што замест абяцаных двух дзён, спортгурткі і асобныя фізкультурнікі, купіўшыя лыжы, чакаюць усіх абяцаных да іх прылад ужо каля месяцу. Можна спадзявацца, што „з боскай дапамогай" усе гэтыя прылады будуць атрыманы тады, калі зіма пройдзе. А пакуль што хлопцы чакаюць і лаюць на чым сьвет стаіць магазын «Дынамо».

Н.

Дапамажам заходнім братом!

Жалезная пята разгуляўшагася фашысцкага тэрору ў Польшчы наступае на працоўных. Заходнія браты з-за турэмных крат крычаць аб дапамозе.

„У дэфэнзыве мне прапанавалі грошы, каб стаць іх агентам і выйсьці на волю. Я ад гэтага адмовіўся. Я сазнаўся, што зьяўляюся членам комуністычнай партыі Заходняй Беларусі, больш я ім нічога гаварыць не хацеў..."

— „Пачаліся катаваньні. Білі мяне бізуном па сьпіне і жываце, сьціскалі пальцы, пушчалі ваду праз нос, пры гэтым закоўвалі рукі і прымацоўвалі іх ніжэй калень пры дапамове палкі. Білі і па галаве..."

— „Катавалі мяне ў працягу 4-х дзён і 4-х начэй: у дзень — насуха, а ўначы — вадою. Усяго ўлілі ў мяне 60-70 бутэлек вады, мяне пужалі, што зробяць са мною тое самое, што з тав. Райтманам, якога зьверска забілі ў дэфэнзыве".

Гэта вытрымка з лісту аднаго політвязьня Беластоцкай турмы.

З наступленьнем зімы і без таго жудаснае становішча політзьняволеных, кінутых урадам Пілсудзкага ў турмы, становіцца яшчэ горшым. 70 проц. усіх політзьняволеных cпрадаюць рознымі хваробамі. Падгоршылася харчаваньне, дэфэнзыва адмаўляецца ад абмундыраваньня і аказаньня мэдыцынскай дапамогі зьняволеным.

ЦК Беларускай сэкцыі МОПР'у як шэф над політвязьнямі турмаў Заходняй Беларусі і Польшчы, праводзіць зараз шырокую кампанію зімовай дапамогі політвязьням. Кампанія будзе весьціся на працягу 3-4 месяцаў. Яна праводзіцца пад лёзунгам. „Наш адказ фашысцкаму тэрору ў Польшчы".

Ячэйкамі МОПР'у Менску ўжо сабрана 732 рублі.

Комсамол у гэтай справе павінен быць у першых шэрагах!

Ўпаў.

Экран і сцэна:

3-ці спэктакль для моладзі.

Уся рабочая моладзь ідзе 7-га студзеня у Белдзяржтэатр глядзець пастаноўку «Сон у летнюю ноч». Білеты ад 10 да 70 кап. у клюбе «КІМ».

„Бакханкі".

(Пастаноўка БДТ-2).

Тэатр зрабіў адзін скачок ад „Апраметнай" да „Каля тэрасы" і гэты факт мы віталі, як жаданьне тэатру бліжэй падыйсьці да масавага гледача. Не яго была віна, што „Каля тэрасы"—п'еса досыць „казусная".

Пасьля гэтай „казуснай" пастаноўкі, зноў некалькі крокаў назад. БДТ-2 ставіць п'есу Эўрыпіда „Бакханкі". І калі ў пастаноўцы „Каля тэрасы" мы наглядалі імкненьне тэатру прыблізіцца да масавага, пролетарскага гледача, калі не, ня гледзячы на бясконцы лік ідэолёгічных хібаў, усё-ж такі разумеў глядач, дык пра „Бакханкі" ні того, ні другога сказаць нельга.

Нават спакушаны ў тэатральных пастаноўках глядач ня можа зразумець „Бакханкі". Аб пізаным, рабочым гледачу мы і не гаворым.

Гэтае неразуменьне і зразумела! П'еса напісана яшчэ ў пятым стагодзьдзі да хрысьціянскае эры.

Барацьба паміж новым (зразумела для таго часу) рэлігійным культам (у асобе бога Дыёніса) і старымі рэлігійнымі традыцыямі (у асобе цара Пэнтэя)—аб гэтым апавядае Эўрыпід у «Бакханках». У п'есе паказваецца тое шаленства, тая лютасьць, да якой можа давесьці чалавека рэлігія.

Увавім сабе, што наш глядач да таго ўрос, што можа зразумець гэтую старажытную „бакханалію". Справа адсюль, бадай, зусім ня зьменіцца. Ці цікава для нас гэтае змаганьне рэлігійных культаў? І калі?—У пятым стагодзьдзі да хрысьціянскай эры.

У сваёй уступнай прамове перакладчык з грэцкай мовы гэтай рэчы, гр. Дрэйзін адзначыў:

„Я і тэатр імкнуліся гэтую рэч прыблізіць да сучаснасьці".

У п'есе, аднак, няма ніводнага моманту, ніводнага намёку на гэтую сучаснасьць. І таму п'еса зусім ня можа цікавіць нашага гледача.

Што з таго, што як заўсёды былі моцны ў сваіх ролях Мінкевіч, Рагавенка, Савьнікаў і Ставюта, што з таго, што оркестр пад кіраўніцтвам Гідгарпа прыгожа ілюстраваў тэкст п'есы, што з таго, што былі прыгожыя дэкорацыі і добрыя сьветавыя эфэкты? Што з таго? Калі п'есу мы ня можам зразумець, калі нас яе зьмест зусім ня можа цікавіць.

Паважаны прамоўца яшчэ ў канцы адзначыў:

— Мы заўсёды будзем ставіць лепшыя старадаўнія п'есы, на нашых акадэмічных сцэнах.

Паўстае пытаньне, ці не знайшлося для тэатру лепшай п'есы, ну хаця-б такой, якая-б адбівала-б клясавую барацьбу, а не змаганьне рэлігійных культаў. Думаем, ёсьць такія п'есы.

Разглядаючы п'есу „Бакханкі" мы карыстаемся выпадкам яшчэ раз падкрэсьліць:

БДАТ-2 ужо другі год, як не зьяўляецца студыяй. Гэта—тэатр! Задача яго, зразумела, ня толькі выхоўваць сваіх артыстых, а адказваць на некаторыя запатрабаваньні нашага гледача.

БДАТ-2—Беларускі нацыянальны тэатр. І яго задача ў першую чаргу абслугоўваць тых, для каго і кім ён створаны. Аўдыторыя патрабуе ад тэатру сучаснасьці. Патрэбен вялікі пералом у працы БДАТ-2 у гэты бок. Вось чаго чакае беларускі пролетарскі глядач.

І аб гэтым кіраўнікам тэатру, бязумоўна, ня трэба забываць.

Мік. Таўбэ.

„Вузел".

(Кіно «Культура»).

Гэты вузел нам паказваюць у 10-15 раз. Пад рознымі назвамі кінофільмаў („Яд", „Жена предревкома", „За власть советов", „Чужие" і інш.), завязваюць у шматлікі раз гэты вузел.

Інжынэр-вынаходца. Вынаходжаньне, зразумела, вельмі каштоўнае. За ім палюе палявыньне. І верны сродак для аўладаньня вынаходзтва—жанчына. Яна апутвае інжынэра, завязваецца вузел.

Разьвязваюць заўсёды міліцыянэры, якія арыштоўваюць усю шайку. Урачыстасьць справядлівасьці.

Фільм «Вузел» нічога новага ў гэтую тэму ня ўнёс. Глядзіцца ён бяз цікавасьці, з сумотаю.

Кін. А.

Чарговыя пастаноўкі БДАТ-2.

2-гі Белдзяржтэатр зараз працуе над вялікай пастаноўкай „Калі сьпяваюць пеўні". Гэтая пастаноўка адбівае настроі нямецкіх рабочых, пасьля прыезду дэлегацыі з Савецкага Саюзу, працу нямецкай компартыі і нарастаньне рэволюцыйнага змаганьня ў Нямеччыне. Аўтар п'есы—савецкі драматург Юр'ін. Пераклад з першатвору—артысты БДАТ-2 Мінкевіч. П'еса пойдзе ў канцы студзеня 1928 году.

Гэтымі днямі ў рабочых клюбах Менску БДАТ-2 паставіць шэраг вечароў з наступнай праграмай: 1) Вечар беларускай комэдыі (п'есы: „Пінская Шляхта", „Чорт і баба" і «Модны шляхцюк»). 2) Вечар замежнай мініацюры (п'есы: „Цырульнік з Берыагу», „Гавань", „Два балбатуны" і „Пільны вартаўнік").

Беларускі сьпеў за межамі.

Гэтымі днямі вярнуліся ў Менск з падарожжа за межамі слухачка Белдзяржмузтэхнікуму—Александроўская (сьпявачка) і артысты БДТ-2—Навіцкі (цымбалісты). Яны аб'езьдзілі ўсю Нямеччыну і Швэцыю, дзе давалі концэрты беларускай музыкі. Концэрты карысталіся вялікім посьпехам, у замежнай прэсе ня было ніводнага хрэннага водгуку аб іх выступленьнях.

Гэтымі днямі Александроўская і Навіцкі выступяць у менскіх клюбах.

Адказы чытачам.

Д. Гнесінай—(№ 1279). Прыёму ў студыю 2 Белдзяржтэатру зараз няма.

В. Сьмірнову (№ 1280). Міжнародны шахматны турнір мяркуецца організаваць у Маскве, увосень 1928 году.

Багранцаву [№ 1281]. Зімовыя вакацыі ўва ўсіх профтэхшколах (а значыць і ў Магілеўска) адбудуцца з 1 па 18 студзеня.

Ал. Ружоваму (№ 1282). 7-гадовы юбілей „Чырвонай Зьмены" будзе ў красавіку 1928 г.

С. Буйко [№ 1283]. Калі камсамолец сябе добра ня выявіў, ячэйка можа прадоўжыць яго кандыдацкі стаж.

ЗГУБЛЕНЫ:

Комсамольскі білет за № 55845, на імя Грыба П. А., выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 4909 і асабістая справа на імя Доваля В, выд. Бабруйскім АК ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет на імя Лухварова А., выд. Полацкім Акругкомам.

— Комсамольскі білет за № 42413, на імя Шыка М., выд. Менакругкомам ЛКСМБ.

Галоўлітбел № 86724.

Адказныя рэдактары: (А. Бараньніязў (А. Курцік

1-ая дзяржаўная друкарня.